© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819-3625 № 1 (2001)

# Удзел моладзі ў назіранні за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

**_Рыгор Гітліц_**

Праблема арганізацыі незалежнага назірання за выбарамі ў Беларусі ўзнікла пасля выбараў у Вярхоўны Савет 13-га склікання 1995–1996 г. і асабліва актуальнай стала пасля рэферэндуму 1996 г., які быў праведзены са шматлікімі парушэннямі і фальсіфікацыямі.

З моманту стварэння Цэнтральнай Каардынацыйнай Рады ў красавіку 2000 г. і стварэння агульнарэспубліканскае сістэмы незалежнага назірання за выбарамі адзначаецца ўстойлівая тэндэнцыя росту прадстаўніцтва моладзі 18–25 гадоў сярод агульнае колькасці назіральнікаў. У назіранні за выбарамі прэзідэнта РБ моладзь склала больш за 40% ад агульнае колькасці назіральнікаў. У Мінску гэты паказчык склаў каля 70%.

Дадзеныя табліцы, якая была складзены па выніках апытання каардынатараў незалежнага назірання, свебчаць аб тым, што:

- найбольш актыўнай з'яўляецца студэнцкая моладзь;
- колькасць моладзі, якая была задзейнічана ў назіранні ў тым ці іншым населеным пункце, непасрэдна залежыць ад колькасці і профелю размешчаных там ВНУ.

Значная колькасць падрыхтаваных маладых назіральнікаў па розным прычынам не змагла прыняць удзел у назіранні, у першаю чаргу па выніках ціску з боку адміністрацыі ВНУ. Вядомы выпадак, калі больш за палову назіральнікаў Маскоўскага раёну г. Мінску, якія складаліся са студэнтаў БДУ, БДПА, Тэхналагічнага інстытуту была вымушана адмовіцца за удзелу ў назіранні ўжо на этапе папярэднега галасавання з-за моцнага ціску і прамых пазрозаў з боку адміністрацый ВНУ. Сітуацыя была выпраўлена, толькі дзякуючы выкарыстанню назіральнікаў з рэзерву.

Адпаведна выглядае і сітуацыя па ўсёй краіне, практычна ва ўсіх ВНУ і іншых навучальных установах ціск на студэнтаў, якія прыймалі удзел у назіранні быў не толькі жорсткім, але і зусім аднастайным, што робіць неабходным далейшае развіццё і ўдасканаленне сістэмы паваой абароны назіральнікаў ад неправамерных дзеянняў адміністрацыі навучальных установаў і прадстаўнікоў улады.




Неабходна адзначыць пэўную заканамернасць рэакцыі назіральнікаў у выпадках ціску – студэнты гуманітарных фаультэтаў, звычайна, аказваюцца больш падрыхтаванымі і устойлівымі да розных формаў уціску.

Адзначана, што яны, звычайна, лепей ведаюць палітычную сітуацыю і больш схільны спасылацца на ідэялагічную матывацыю свайго удзелу ў назіранні. Студэнтам тэхнічных ВНУ бракуе ведаў у галіне грамадскіх дысціплінаў, яны больш схільны разглядаць свой удзел у назіранні як звычайную працу, за якую можна атрымаць кампенсацыю і ў выпадку ціску вельмі часта адмаўляюцца ад удзелу ў назіранні. Арганізацыя дадатковых адукацыйных семінараў па асновам грамадскага ладу і паліталогіі для гэтае катэгорыі моладзі дапамагла б надалей паменшыць колькасць адмоваў ад назірання і ўзвысіла б агульную якасць працы.

Іншай актуальнай праблемай з'яўляецца праблема мабілізацыі моладзі для ўдзелу ў назіранні. Практыка паказвае, што мабілізацыя, якая праводзіцца шляхам прыцягнення назіральнікаў з дапамогаю невялікіх рэкламных аб'яваў у незалежнай дэмакратычнай прэсе на календарыках і г.д. дае нязначны эфект. Па розным дадзеным, гэтымі сродкамі было прыцягнута не больш за 5% назіральнікаў. Частка моладзі, якая была прыцягнута такім шляхам, зусім нязначная. Асноўная маса моладзі прыцягвалася каардынатарамі на несістэмнай аснове з ліку асабістых знаёмых і сяброў.

Такая методыка падаецца непаўнавартаснай, што і было выяўлена ў выпадках, калі некаторыя каардынатары, якія арганізоўвалі назіранне за выбарамі з Палату Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу РБ восенню 2000 г., не змаглі прыняць удзел у назіранні за выбарамі Прэзідэнта РБ. Значная частка маладых назіральнікаў, якія былі прыцягнуты імі па вызначанай методыцы адмовілась ад пра-




цы з іншымі каардынатарамі і не прыняла ўдзелу ў кампаніі назірання. Напрыклад, у Мінску новыя каардынатары ў 4-ох раёнах былі вымушаны набіраць і навучаць да 80% новых назіральнікаў. Натуральна, што стварэнне грамадсвае структуры пры Цэнтральнай Каардынацыйнай Радзе (альбо пры адной з арганізацыяў, якія ўваходзяць у яе склад), якая б аб'ядноўвала маладых назіральнікаў і давала магчымасць навучання і удзелу ў грамадскім жыцці ў перыяд паміж выбарамі, дазвоць забяспечыць неабходную пераемнасць у межах ВНУ. Студэнты, якія скончылі навучанне, змогуць прыцягваць у сістэму назірання студэнтаў з малодшых курсаў.

Яшчэ адна праблема, пра якую нельга не сказаць, з'яўляецца праблемай вельмі нізкага ўзроўню даходаў насельніцтва ўвогуле, што асабліва заўважна ў студэнцкім асяроддзі. Сярэдняя стыпендыя ў ВНУ краіны не перавышае 15–20 долараў ЗША і з'яўляецца зусім недастатковай нават для мінімальнага набору прадуктаў.

Бацькі большасці студэнтаў таксама маюць невысокі узровень даходаў і паўнаваратай дапамогі сваім дзецям яны таксама аказаць не ў стане. Большасць маладых людзей вымушаны шукаць дадатковыя заробкі не для таго, каб дазволіць сабе раскошу, але толькі для таго каб забяспечыць пражыццёвы мінімум. Вынікам вышэйзгаданага, з'уляецца тое, што памер кампенсацыі выдаткаў, які традыцыйна прапаноўваецца назіральнікам, зусім недастатковы. Ён не пакрывае нават выдаркаў на харчаванне, асабліва з улікам таго, што паўнавартаснае назіранне прадугледжвае прысутнасць на выбарчым участку на працягу ўсяго працоўнага дня не толькі ў дзень выбараў, але і 5-ці дзён папярднега галасавання.

Дамініруючая роля студэнтаў ВНУ сярод усяе моладзі, якая занята ў незалежным назіранні, устойлівы рост колькасці прадстаўнікоў гэтае катэгорыі ў сістэме назірання ўвогуле, негледзячы на сваю падвышаную неабароненасць, дазваляе зрабіць выснову, што студэнцтва з'яўляецца для сістэмы незалежнага назірання базавай групай, асноўнай крыніцай моладзевых кадраў. Прадуманая і сістэмная праца са студэнтамі дазволіць і надалей ажыццяўляць незалежнае і якаснае назіранне, не адчуваючы дэфіцыту кадраў.



# Ад рэдакцыі

*«Палітычная Сфера» прапануе Вашай увазе артыкул кандыдата палітычных навук Ніны Антановіч, прысвечаны аналізу філасоўска-палітычнай канцэпцыі Джона Ролза. Як слушна сцвярджае вядомы еўрапейскі сацыёлаг Ёран Тэрборн, ў шырокай і невыразна акрэсленай «сацыяльнай галіне» можна вылучыць толькі адно імя амерыканскага паходжання — імя Джона Ролза — якое мае апошнім часам межкантынентальны ўплыў, параўнальны з значнасцю такіх еўрапейскіх імёнаў, як Пўер Бурдзьё, Мішэль Фуко, Энтані Гіддэнс або Юрген Хабермас. Ад сабе мы дададзім да гэтых словаў, што для сучаснай палітычнай філасофіі Злучаных Штатаў Ролз робіць тое, што раней зрабіў Талкот Парсанс для амерыканскай палітычнай сацыялогіі, ў сэнсе інтэграцыі навукоых супольнасцяў Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Менавіта публікацыя ў 1971 годзе ягонай працы «Тэорыя справядлівасці» (Rawls J. A Theory of Justice) адзначыла заканчэнне крызіса ў справе выкарыстання філасофіі як метадалогіі даследвання палітычнай рэчаіснасці. Адначасова яна сталася адказам ліберальнае думкі на тую крытыку, якая абрынулася ў той час на ліберальныя ідэалы і інстытуцыі з боку правых, новых левых, і прыхільнікаў нэалібэралізма ў варыянце Фрыдрыха фон Хаека. Так атрымалася, што гэтая кніга была ўспрынята як ідэалагічная праграма, добра прыстасаваная да палітычнае барацьбы. Зараз яна ўваходзіць ў кананічны корпус тэкстаў левага крыла амерыканскае Дэмакратычнае партыі і ў праграмы шматлікіх лібэральных дзеячоў рознага маштабу. Таму тэорыя Ролза апынулася ў цэнтры грамадскай палемікі, што, з аднаго боку, пацягнула хуткую распрацоўку альтэрнатыўных тэорый, з другога — выклікала хвалю ўдакладненняў і паглыбленняў, ў тым ліку і за аўтарствам самога Ролза.Ва ўсялякім разе, тэорыя Ролза пабудавала ў амерыканскай навуцы мост паміж паліталогіяй і філасофіяй. Яна, безумоўна, будуецца на традыцыйным для амерыканскага задумлення прагматызме і рацыяналізме, але належыць да групы тэорыяў сацыяльнага выбара. Такім чынам, ягоныя канцэпцыі, падмурак якіх быў закладзены ў «Тэорыі справядлівасці», зўяўляюцца актуальным накірункам накірункам лібэральнага палітычнага задумлення.*